КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа вышэйшай адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
____________ А.В.Макоўчык
____________ 2019 г.

Рэгістрацыйны УД 31-1-26 /вуч.

**Беларуская анамастыка**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па дысцыпліне па выбары для спецыяльнасці:**

1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

2019 г.

2

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта ОСВО 1-02 03 03, уведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 87 і вучэбнага плана для спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Н.А. Радзіваноўская, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.С. Васілеўская, загадчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства, БДПУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

В.У. Русак, загадчык кафедры беларускай філалогіі УА "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 6 ад 27.12.2019 г.)

Загадчык кафедры
мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ______________ Д.В. Дзятко

Саветам філалагічнага факультэта ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 4 ад 27.12.2019 г.)

Старшыня савета ______________ В.Д. Старычонак

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела БДПУ ______________ С.А. Старадуб

Директор библиотеки ______________ Н.П. Сятковская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэта дысцыпліны па выбары "Беларуская анамастыка"** – падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для выкладання беларускай мовы ў навучальных установах рознага тыпу, закласці тэарэтычную базу і на яе аснове навучыць студэнтаў аналізаваць анамастычныя адзінкі.

**Задачы дысцыпліны па выбары "Беларуская анамастыка":**

– даць студэнтам асноўныя палажэнні сучаснай тэорыі ўласнага імя;

– пазнаёміць з найбольш эфектыўнымі і перспектыўнымі метадамі анамастычных даследаванняў;

– развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне студэнта, навыкі крытычнага аналізу найбольш складаных тэарэтычных з'яў;

– сфарміраваць навыкі практычнага ўкаранення атрыманых студэнтамі ведаў у іх будучай прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

– навучыць студэнтаў практычна прымяняць набытыя веды ў сваёй прафесійнай дзенасці, у школьным вучэбным працэсе;

– выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

Вывучэнне дысцыпліны па выбары "Беларуская анамастыка" павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў *акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.*

***Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый***

Студэнт павінен:

АК-5. Быць здольным ствараць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

***Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста***

Студэнт павінен:

СЛК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

СЛК-4. Валодаць навыкамі здароўезберагання.

***Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый***

Студэнт павінен быць здольным:

ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў і форм.

ПК-4. Арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў.

ПК-11. Развіваць вучэбныя магчымасці і здольнасці навучэнцаў на аснове сістэмнай педагагічнай дыягностыкі.

ПК-12. Развіваць навыкі самастойнай работы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і інш. крыніцамі інфармацыі.

ПК-13. Арганізоўваць і праводзіць карэкцыйна-педагагічную дзейнасць з навучэнцамі.

ПК-14.Папярэджваць і пераадольваць непяспяховасць навучэнцаў.

ПК-15.Фармуляваць адукацыйныя і выхаваўчыя мэты.

ПК-16 – ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.

ПК-17.Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

ПК-18.Арганізоўваць цэласны адукацыйны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый.

ПК-19.Аналізаваць і ацэньваць педагагічныя з’явы і падзеі мінулага ў святле сучасных навуковых ведаў.

У выніку вывучэння дысцыпліны па выбары “Беларуская анамастыка” студэнт павінен ***ведаць:***

– асноўныя палажэнні сучаснай тэорыі ўласнага імя;

– разнастайныя анамастычныя тэрміны і паняцці;

– выдатных даследчыкаў беларускіх уласных імёнаў і іх асноўныя навуковыя працы;

– галоўныя навуковыя праблемы сучаснай беларускай анамастыкі і перспектыўныя шляхі яе развіцця;

– найбольш эфектыўныя і перспектыўныя метады і прыёмы аналізу анамастычнага матэрыялу;

– навуковую і даведачную літаратуру па дадзенай галіне моваведчай навукі.

У выніку вывучэння дысцыпліны па выбары “Беларуская анамастыка” студэнт павінен ***умець:***

– адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя факты;

– праводзіць самастойныя лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– заўважаць агульнае і адметнае ў навуковых фактах розных анамастычных разрадаў лексікі;

– карыстацца разнастайнымі анамастычнымі слоўнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі і даведачнай літаратурай;

– выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы.

У выніку вывучэння дысцыпліны па выбары “Беларуская анамастыка” студэнт павінен ***валодаць:***

– сістэмай навуковых паняццяў беларускай анамастыкі;

– метадамі анамастычных даследаванняў і методыкай збіральніцкай працы;

– методыкай выкладання беларускай анамастыкі ў школе;

– навыкамі арганізацыі навуковай анамастычнай працы вучняў і кіравання анамастычным гуртком.

*Месца вучэбнай дысціпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.*“Беларуская анамастыка”– вучэбная дысцыпліна, якая мае ярка выражаны

міждысцыплінарны характар, што абумоўлена яе аб’ектам даследавання. Паколькі ўласнае імя прысутнічае і аналізуецца ў розных навуках – мовазнаўстве, гісторыі, геаграфіі, астраноміі і інш., то гэта дазваляе настаўніку ў працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры на анамастычным матэрыяле паспяхова ажыццяўляць міжпрадметныя сувязі.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.* Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яго з лінгвістычнымі дысцыплінамі (Сучасная беларуская літаратурная мова, Беларуская дыялекталогія, Актуальныя праблемы беларускай мовы, Гісторыя беларускай мовы), а таксама са школьным курсам беларускай мовы. Асаблівая ўвага пры выкладанні асобных тэм павінна ўдзяляцца вывучэнню спецыфічных рыс беларускіх уласных імёнаў. Лекцыйныя і практычныя заняткі, прадугледжаныя вучэбным планам, узаемна звязаны і арганічна дапаўняюць адно аднаго, даючы магчымасць паглыбіць і ўдасканаліць набытыя веды.

У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская анамастыка” на 4 курсе адводзіцца: усяго – 100 гадзін, аўдыторных – 40 гадзін, на самастойную працу – 60 гадзін (з іх 36 гадзін на падрыхтоўку да экзамену).

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

*Размеркаванне гадзін па семестрах на дзённым аддзяленні:*

8 семестр:

Лекцыі – 22 гадзіны.

Практычныя заняткі – 18гадзін.

На самастойную працу – 24 гадзіны.

Форма атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – **экзамен**.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**1. Уводзіны.** Анамастыка як раздзел мовазнаўства. Прадмет, мэта і задачы дысцыпліны. Асноўныя раздзелы сучаснай анамастыкі: антрапаніміка, тапаніміка, зааніміка, касманіміка, ктэматаніміка (хрэматаніміка), аб’ект даследавання кожнага раздзела. Галоўныя праблемы даследавання анамастычнай навукі. Перыядызацыя гісторыі анамастычнай навукі.

**2. Асноўныя пытанні тэорыі анамастыкі.** Уласнае імя як лінгвістычная катэгорыя. З гісторыі вывучэння ўласных імёнаў. Погляды старажытнагрэчаскіх і старажытнарымскіх вучоных. Дыскусіі аб сутнасці ўласнага імя ў эпоху Адраджэння (Т.Гопс, Дж.Лок, Г.Лейбніц і інш.) і ў ХІХ ст. (Дж.Сцюарт Міль, Х.Джозэф і інш.). Праблема спецыфікі ўласнага імя ў сучаснай лінгвістыцы (Б.Рассал, П.Крыстоферсэн, А.Гардзінер, А.Бялецкі, А.Суперанская, В.Ніканаў, А.Рэфармацкі, Ю.Карпенка і інш.). Спецыфіка ўласнага імя.

Мяжа паміж агульнай і анамастычнай лексікай.

Паняцце “анамастычная прастора”. Аб’ём і змест анамастычнай прасторы. Шматзначнасць тэрміна “анамастычная прастора”. Погляды А.Бялецкага, У.Тапарова, А.Супяранскай і інш. . Анамастычная прастора мастацкага тэксту. Асаблівасці і праблемы вывучэння онімаў у мастацкім тэксце.

Сістэмныя сувязі ў анамастычнай прасторы і паасобных яе разрадах (У.Тапароў і інш.). Класіфікацыя ўласных імёнаў.

**3. Метады анамастычных даследаванняў.** Асноўныя метады анамастычных даследаванняў. Апісальны метад як найбольш шырока выкарыстоўваемы ў навуковых працах. Гістарычны метад – адзін з асноўных пры аналізе анамастычнага матэрыялу. Параўнальна-супастаўляльны метад і яго роля пры вывучэнні онімаў у блізкароднасных мовах. Арэальны метад (ізаглосны, метад картаграфавання) і асаблівасці яго прымянення. Семіятычны метад вывучэння онімаў. Стылістычны метад як асноўны пры вывучэнні літаратурнай анамастыкі. Лінгвапсіхалагічны (псіхалінгвістычны) метад, яго разнавіднасці ў анамастычнай навуцы. Статыстычны метад, вынікі яго прымянення пры даследаванні разнастайных разрадаў онімаў.

**4. Беларуская антрапаніміка.**

*4.1. З гісторыі беларускай антрапаніміі.* Праблемы перыядызацыі ўсходнеславянскай антрапаніміі.

Асноўныя этапы і працэсы ў гісторыі беларускай антрапаніміі. Дахрысціянскі перыяд і яго адметнасці. Старажытныя адапелятыўныя імёны і прычыны іх узнікнення.

Перыяд з XI да XVII стст. Уплыў хрысціянства на іменалагічную сістэму ўсходнеславянскіх народаў. Кананічныя імёны. “Древний русский календарь. По месячным минеям XI – XIII вв.” І.І. Сразнеўскага. Фанетычная адаптацыя кананічных імёнаў у старабеларускай мове.

Перыяд з XVIII да XIX стст., яго адметнасці ў гісторыі беларускага антрапанімікона. З’яўленне псеўданімаў.

Новы перыяд (XX ст.) у гісторыі беларускай антрапанімікі. Дэхрысцінізацыя і дэмакратызацыя антрапонімаў. Якасныя змены іменніка ў савецкі час. Характэрныя рысы сучаснага перыяду ў беларускай і ўсходнеславянскай антрапаніміі (з'яўленне разнастайных імёнаў-неалагізмаў, наваўтварэнняў ад кананічных імёнаў, пашырэнне старажытных славянскіх імёнаў і інш.).

*4.2. Сучасны беларускі іменнік.* Тыпы беларускіх прозвішчаў паводле іх лексіка-семантычнага складу (адантрапанімічныя, адапелятыўныя, адтапанімічныя). Склад, структура і асаблівасці кожнага з гэтых тыпаў беларускіх прозвішчаў. Тыпы беларускіх прозвішчаў паводле структурна-тыпалагічных асаблівасцей (прозвішчы суфіксальнага, лексіка-семантычнага і сінтаксічна-марфалагічнага ўтварэння).

Мянушкі, іх паходжанне і месца ў антрапанімічнай сістэме. Сучасныя беларускія мянушкі. Псеўданімы, іх разнавіднасці і спосабы ўтварэння. Імёны па бацьку.

*4.3. Антрапонімы ў кантэксце мастацкага твора.* Сацыякультурная і стылістычная канатацыя ўласных імёнаў. Загаловак як галоўны кампанент мастацкага тэксту.

**5. Беларуская тапаніміка.** З гісторыі беларускай тапанімікі. Даследаванні А.Качубінскага, Ю.Трусмана, Я.Карскага, А.Сабалеўскага, А.Шахматава, Э.Вальтэра, Г.Ільінскага і інш. Ажыўленне тапанімічных даследаванняў на Беларусі ў 50 – 60-ыя гг. XX ст. Сучасны стан беларускай тапанімічнай навукі (агульная характарыстыка). Асноўныя разрады тапанімічных назваў (гідронімы, айконімы, урбанонімы, драмонімы, дрымонімы і інш.). Моўная прыналежнасць тапонімаў Беларусі.

Тапонімы ў мастацкім творы, іх структура і стылістычная функцыя.

**6. Агульная і беларуская касманіміка.** Змест і аб'ём тэрмінаў "касманімія" і "астранімія". Назвы сузор'яў, зорак і планет у беларускай мове. Асаблівасці беларускай народнай касманіміі.

Касмонімы і астронімы ў мастацкім творы, іх структура і асаблівасці ўжывання. Назвы дробных аб'ектаў касмічнай прасторы.

**7. Беларуская ктэматаніміка**. З гісторыі беларускай ктэматаніміі. Агульная характарыстыка беларускай ктэматаніміі. Разрады ктэматонімаў, іх роля і месца ў анамастычнай прасторы і грамадскім жыцці.

Асаблівасці ктэматонімаў у мастацкім творы.

**8. Анамастыка ў школе.** Анамастычная лексіка і яе вывучэнне ў школе. Пазакласная праца з вучнямі па зборы і вывучэнні онімаў.

Даведачная і навукова-папулярная літаратура па анамастыцы.

Анамастычная лексікаграфія.

## Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны па выбары
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа | Літаратура | Формы кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | |
| 1 | **Беларуская анамастыка** | **22** | **18** | **24** | | |
| 1.1. | **Уводзіны** | **2** | | **2** | | |
| 1.1. 1 | 1. Анамастыка як раздзел мовазнаўства.<br>2. Прадмет, мэта і задачы дысцыпліны.<br>3. Асноўныя раздзелы сучаснай анамастыкі: антрапаніміка, тапаніміка, зааніміка, касманіміка, ктэматаніміка (хрэматаніміка), аб'ект даследавання кожнага раздзела.<br>4. Галоўныя праблемы даследавання анамастычнай навукі.<br>5. Перыядызацыя гісторыі анамастычнай навукі. | 2 | | 2 | 1, 12, 15 | |
| 1.2 | **Асноўныя пытанні тэорыі анамастыкі.** | **4** | **4** | **4** | | |
| 1.2. 1 | 1. Уласнае імя як лінгвістычная катэгорыя.<br>2. З гісторыі вывучэння ўласных імёнаў.<br>3. Погляды старажытнагрэчаскіх і старажытнарымскіх вучоных.<br>4. Дыскусіі аб сутнасці ўласнага імя ў эпоху Адраджэння (Т.Гопс, Дж.Лок, Г.Лейбніц і інш.) і ў XIX ст. (Дж.Сцюарт Міль, Х.Джозэф і інш.).<br>5. Праблема спецыфікі ўласнага імя ў сучаснай лінгвістыцы (Б.Рассал, П.Крыстоферсэн, А.Гардзінер, А.Бялецкі, А.Суперанская, В.Ніканаў, А.Рэфармацкі, Ю.Карпенка і інш.).<br>6. Спецыфіка ўласнага імя. | 2 | | 4 | 6, 12, 13, 19 | |
| 1.2. 2 | 1. Мяжа паміж агульнай і анамастычнай лексікай.<br>2. Паняцце "анамастычная прастора". Аб'ём і змест анамастычнай прасторы. Шматзначнасць тэрміна "анамастычная прастора". Погляды | 2 | | | 12, 13, 19 | Вуснае апытванне, праца са слоўнікамі. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | А.Бялецкага, У.Тапарова, А.Супяранскай і інш.<br>3. Анамастычная прастора мастацкага тэксту. Асаблівасці і праблемы вывучэння онімаў у мастацкім тэксце.<br>4. Сістэмныя сувязі ў анамастычнай прасторы і паасобных яе разрадах (У.Тапароў і інш.). Класіфікацыя ўласных імёнаў. | | | | | |
| 1.2. 3 | 1. Уласнае імя як лінгвістычная катэгорыя. З гісторыі вывучэння ўласных імёнаў.<br>2. Погляды старажытнагрэчаскіх і старажытнарымскіх вучоных.<br>3. Дыскусіі аб сутнасці ўласнага імя ў эпоху Адраджэння.<br>4. Праблема спецыфікі ўласнага імя ў сучаснай лінгвістыцы. Спецыфіка ўласнага імя. | | 2 | | 1, 12, 13 | Выступленне з рэфератамі. |
| 1.2. 4 | 1. Анамастычная прастора мастацкага тэксту.<br>2. Асаблівасці і праблемы вывучэння онімаў у мастацкім тэксце.<br>3. Сістэмныя сувязі ў анамастычнай прасторы і паасобных яе разрадах.<br>4. Класіфікацыя ўласных імёнаў. | | 2 | | 12, 20 | Камбінаванае апытванне, праверка выканання практыкаванняў. |
| 1.3 | **Метады анамастычных даследаванняў** | **4** | **2** | **4** | | |
| 1.3. 1 | 1. Асноўныя метады анамастычных даследаванняў.<br>2. Апісальны метад як найбольш шырока выкарыстоўваемы ў навуковых працах.<br>3. Гістарычны метад – адзін з асноўных пры аналізе анамастычнага матэрыялу.<br>4. Параўнальна-супастаўляльны метад і яго роля пры вывучэнні онімаў у блізкароднасных мовах. | 2 | | 2 | 12, 16 | |
| 1.3. 2 | 1. Арэальны метад (ізаглосны, метад картаграфавання) і асаблівасці яго прымянення.<br>2. Семіятычны метад вывучэння онімаў.<br>3. Стылістычны метад як асноўны пры вывучэнні літаратурнай анамастыкі.<br>4. Лінгвапсіхалагічны (псіхалінгвістычны) метад, яго разнавіднасці ў анамастычнай навуцы.<br>5. Статыстычны метад, вынікі яго прымянення пры даследаванні разнастайных разрадаў онімаў. | 2 | | 2 | 12, 16 | |
| 1.3. | 1. Апісальны метад як найбольш шырока выкарыстоўваемы ў навуковых | | 2 | | 11, 12, 16 | Рэйтынгавая |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | працах.<br>2. Гістарычны метад – адзін з асноўных пры аналізе анамастычнага матэрыялу.<br>3. Параўнальна-супастаўляльны метад і яго роля пры вывучэнні онімаў у блізкароднасных мовах.<br>4.Семіятычны метад вывучэння онімаў.<br>5. Стылістычны метад як асноўны пры вывучэнні літаратурнай анамастыкі.<br>7. Статыстычны метад, вынікі яго прымянення пры даследаванні разнастайных разрадаў онімаў. | | | | | кантрольная работа № 1. |
| **1.4** | **Беларуская антрапаніміка** | **6** | **6** | **10** | | |
| 1.4. 1 | 1. Праблемы перыядызацыі ўсходнеславянскай антрапаніміі.<br>2. Асноўныя этапы і працэсы ў гісторыі беларускай антрапаніміі.<br>3. Дахрысціянскі перыяд і яго адметнасці. Старажытныя адапелятыўныя імёны і прычыны іх узнікнення.<br>3. Перыяд з XI да XVII стст. Уплыў хрысціянства на іменалагічную сістэму ўсходнеславянскіх народаў. Кананічныя імёны.<br>4. Перыяд з XVIII да XIX стст., яго адметнасці ў гісторыі беларускага антрапанімікона. З’яўленне псеўданімаў.<br>5. Новы перыяд (XX ст.) у гісторыі беларускай антрапанімікі. Дэхрысцінізацыя і дэмакратызацыя антрапонімаў. Якасныя змены іменніка ў савецкі час.<br>6. Характэрныя рысы сучаснага перыяду ў беларускай і ўсходнеславянскай антрапаніміі (з’яўленне разнастайных імёнаў-неалагізмаў, новаўтварэнняў ад кананічных імёнаў, пашырэнне старажытных славянскіх імёнаў і інш.). | 2 | | | 1, 2, 3, 4, 8 | |
| 1.4. 2 | 1. Сучасны беларускі іменнік.<br>2. Тыпы беларускіх прозвішчаў паводле іх лексіка-семантычнага складу (адантрапанімічныя, адапелятыўныя, адтапанімічныя). Склад, структура і асаблівасці кожнага з гэтых тыпаў беларускіх прозвішчаў.<br>3. Тыпы беларускіх прозвішчаў паводле структурна-тыпалагічных асаблівасцей (прозвішчы суфіксальнага, лексіка-семантычнага і сінтаксічна-марфалагічнага ўтварэння).<br>4. Мянушкі, іх паходжанне і месца ў антрапанімічнай сістэме. Сучасныя | 2 | | 6 | 1, 2, 3, 4, 8 | Камбінаванае апытванне, выкананне практыкаванняў. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | беларускія мянушкі.<br>5. Псеўданімы, іх разнавіднасці і спосабы ўтварэння. | | | | | |
| 1.4.3 | 1. Антрапонімы ў кантэксце мастацкага твора.<br>2. Сацыякультурная і стылістычная канатацыя ўласных імёнаў.<br>3. Загаловак як галоўны кампанент мастацкага тэксту. | 2 | | 4 | 1, 19, 20 | |
| 1.4.4 | 1. Асноўныя этапы і працэсы ў гісторыі беларускай антрапаніміі.<br>2. Дахрысціянскі перыяд і яго адметнасці.<br>3. Старажытныя адапелятыўныя імёны і прычыны іх узнікнення.<br>4. Уплыў хрысціянства на іменалагічную сістэму ўсходнеславянскіх народаў.<br>5. З'яўленне псеўданімаў у беларускім антрапаніміконе.<br>6. Дэхрысцінізацыя і дэмакратызацыя антрапонімаў. Якасныя змены іменніка ў савецкі час. | | 2 | | 1, 2, 3, 4, 8, 19 | Франтальнае апытванне, выкананне практыкаванняў. |
| 1.4.5 | 1. Вызначэнне тыпаў беларускіх прозвішчаў паводле іх лексіка-семантычнага складу (адантрапанімічныя, адапелятыўныя, адтапанімічныя).<br>2. Тыпы беларускіх прозвішчаў паводле структурна-тыпалагічных асаблівасцей (прозвішчы суфіксальнага, лексіка-семантычнага і сінтаксічна-марфалагічнага ўтварэння). | | 2 | | 1, 2, 3, 4, 8, 19 | Камбінаванае апытванне, праверка выканання практыкаванняў; вусныя паведамленні. |
| 1.4.6 | 1. Мянушкі, іх паходжанне і месца ў антрапанімічнай сістэме.<br>2. Сучасныя беларускія мянушкі. | | 2 | | 1, 2, 3, 4, 8, 19 | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |
| **1.5** | **Беларуская тапаніміка** | **2** | **2** | | | |
| 1.5.1 | 1. З гісторыі беларускай тапанімікі. Даследаванні А.Качубінскага, Ю.Трусмана, Я.Карскага, А.Сабалеўскага, А.Шахматава, Э.Вальтэра, Г.Ільінскага і інш.<br>2. Ажыўленне тапанімічных даследаванняў на Беларусі ў 50 – 60-ыя гг. XX ст.<br>3. Сучасны стан беларускай тапанімічнай навукі (агульная характарыстыка).<br>4. Асноўныя разрады тапанімічных назваў (гідронімы, айконімы, урбанонімы, драмонімы, дрымонімы і інш.). Моўная прыналежнасць тапонімаў Беларусі. | 2 | | | 1, 6, 7, 11, 12, 15, 18, 19, 20 | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.5.2 | 1. Тапонімы ў мастацкім творы.<br>2. Структура і стылістычная функцыя тапонімў у мастацкім тэксце. | | 2 | | 19, 20 | Індывідуальнае апытванне, праверка картатэкі моўных фактаў. |
| **1.6** | **Агульная і беларуская касманіміка** | **2** | **2** | | | |
| 1.6.1 | 1. Змест і аб’ём тэрмінаў “касманімія” і “астранімія”. 2. Назвы сузор’яў, зорак і планет у беларускай мове. 3. Асаблівасці беларускай народнай касманіміі. | 2 | | | 13 | |
| 1.6.2 | 1. Касмонімы і астронімы ў мастацкім творы, іх структура і асаблівасці ўжывання.<br>2.Назвы дробных аб’ектаў касмічнай прасторы. | | 2 | | 19, 20 | Вусныя паведамленні. |
| **1.7** | **Беларуская ктэматаніміка** | **2** | | **2** | | |
| 1.7.1 | 1. З гісторыі беларускай ктэматаніміі.<br>2.Агульная характарыстыка беларускай ктэматаніміі. 3. Разрады ктэматонімаў, іх роля і месца ў анамастычнай прасторы і грамадскім жыцці.<br>4. Асаблівасці ктэматонімаў ў мастацкім творы. | 2 | | 2 | 19, 20 | |
| **1.8** | **Анамастыка ў школе** | | **2** | **2** | | |
| 1.8.1 | 1. Анамастычная лексіка і яе вывучэнне ў школе.<br>2. Пазакласная праца з вучнямі па зборы і вывучэнні онімаў.<br>3. Даведачная і навукова-папулярная літаратура па анамастыцы.<br>4. Анамастычная лексікаграфія. | | 2 | 2 | 9, 18, 14, 17 | Рэйтынгавая кантрольная работа № 3. |
| | **Усяго ў 8 семестры** | **22** | **18** | **24** | | **экзамен** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Ономастика Беларуси. Антропонимия: учеб. для студентов филол. фак. высш. учеб. заведений / А. М. Мезенко [и др.]. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2017. – 397 с.

**Дадатковая літаратура**

1 Багамольнікава, Н.А. Тапанімія Гомельшчыны: структурна-семантычная характарыстыка: манаграфія / Н. А. Багамольнікава. – Гомель : Гомел. дзярж. ун-т, 2008. – 242 с.

2. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія: прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М. В. Бірыла. –Мінск : Навука і тэхніка,1969. – 504 с.

3. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія: структура ўласных мужчынскіх імён/ М. В. Бірыла. –Мінск : Навука і тэхніка,1982. – 319 с.

4. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія: уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 326 с

5. Бірыла, М.В. Літоўскія элементы ў беларускай анамастыцы / М. В. Бірыла, А. П. Ванагас. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 99 с.

6. Восточно-славянская ономастика / А. В. Суперанская [и др.] ; под ред. А. В. Суперанской. – М. : Наука, 1972. – 367 с.

7. Генкин, В.М. Ойконимия и катойконимия Белорусского Поозерья : учеб.-метод. пособиедля студентов-филологов / В. М. Генкин. – Витебск : Витеб. гос. ун-т, 2009. – 115 с.

8. Гурская, Ю.А. Древние фамилии современного белорусского ареала на славянском и балтийском фоне / Ю. А. Гурская. – Минск : Право и экономика, 2011. – 446 с.

9. Емельяновіч, В. М. Беларуская анамастыка ў школе: матэрыялы спецкурса і спецсемінара / В. М. Емельяновіч. – Брэст : Брэсц. дзярж. ун-т, 1999. – 50 с.

10. Казлова, Р. М. Беларуская і славянская гідранімія. Праславянскі фонд :у 5 т. / Р. М. Казлова. – Гомель : Гомел. дзярж. ун-т, 2011. – Т. 5. – 248 с.

11. Лемцюгова, В.П. Беларуская айканімія: лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці / В. П. Лемцюгова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 154 с.

12. Мезенка, Г.М. Беларуская анамастыка : навуч. дапам. для студэнтаў ун-таў / Г. М. Мезенка. – Мінск : Выш.шк., 1997. – 119 с.

13. Суперанская, А. В. Общая теория имени собственного / А. В. Суперанская. – 3-е изд. – М. : URSS : Либроком, 2009. – 365 с.

14. Суперанская, А. В. Ономастическая лексикография / А. В. Суперанская. – М. : Наука, 1989. – 112 с.

15. Суперанская, А. В. Что такое топонимика?: из истории географических названий / А. В. Суперанская. – М. : URSS : Либроком, 2014. – 175 с.

16. Теория и методика ономастических исследований / А. В. Суперанская [и др.] ; отв. ред. А. П. Непокупный. – 2-е изд. – М. : URSS : ЛКИ, 2007. – 254 с.

17. Шахоўская, С. У. Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця / С. У. Шахоўская. – Мінск : Красная звезда, 2012. – 258 с.

18. Шур, В. Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапанімія і тапанімія: вучэб. дапам. / В. Шур. – Мазыр : Выснова, 2018. – 355 с.

19. Шур, В. Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапаніміка і тапаніміка : дапам. для настаўнікаў / В. Шур. – Мінск. : Маст. літ., 1998. – 237 с.

20. Шур, В.В. Уласнае імя ў соцыуме і мастацкім тэксце : манаграфія / В. В. Шур. – Мінск : Ін-т радыялогіі, 2015. – 298 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ ПА ВЫБАРЫ "БЕЛАРУСКАЯ АНАМАСТЫКА"

Для павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў мэтазгодна на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ прыцягваць кожнага студэнта да сістэматычнай самастойнай работы. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту.

Матэрыял, рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыка з першых тыдняў семестра. Матэрыял для самастойнай працы, распрацаваны выкладчыкамі кафедры, можа ўключаць комплексы індывідуальных заданняў па пэўных тэмах, сістэму індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны.

На самастойнае вывучэнне варта прапаноўваць асобныя тэмы лекцый або іх часткі па раней складзеным плане з указаннем асноўнай і дадатковай літаратуры па праблеме.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Тут і аптымальна выбраная форма працы, і дакладныя, канкрэтныя ўказанні і рэкамендацыі выкладчыка з наступнай аб'ектыўнай ацэнкай яе вынікаў і, самае важнае, сістэматычнасць і паслядоўнасць у правядзенні такой працы.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае выкананне кантрольных прац, тэстаў, падрыхтоўку вусных паведамленняў і пісьмовых рэфератаў па вызначанай тэматыцы, знаёмства з навуковай, навукова-папулярнай, хрэстаматыйнай літаратурай, з тэрміналагічнымі слоўнікамі, пераклад, рэферыраванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў і інш.

Самастойная работа студэнтаў праводзіцца ў аб'ёме, прадугледжаным вучэбным планам.

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Коль-касць гадзін на СПС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1.1.1 | Перыядызацыя гісторыі анамастычнай навукі. | 2 | Падрыхтаваць канспект пра асноўныя перыяды развіцця анамастыкі. | Канспект |
| 1.2.1 | Дыскусіі аб сутнасці ўласнага імя ў эпоху Адраджэння (Т.Гопс, Дж.Лок, Г.Лейбніц і інш.) і ў XIX ст. (Дж.Сцюарт Міль, Х.Джозэф і інш.). Праблема спецыфікі ўласнага імя ў сучаснай лінгвістыцы (Б.Рассал, | 4 | Падрыхтаваць партфоліа, дзе будуць праілюстраваны асноўныя дыскусійныя погляды на сутнасць уласнага імя ў розныя часы. | Прэзентац ыя |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | П.Крыстоферсэн, А.Гардзінер, А.Бялецкі, А.Суперанская, В.Ніканаў, А.Рэфармацкі, Ю.Карпенка і інш.). | | | |
| 1.3 | Метады анамастычных даследаванняў. | 4 | Падрыхтаваць прзентацыю пра метады анамастычных даследаванняў з прывядзеннеў прыкладаў выкарыстання метада пры вывучэнні онімаў. | Прэзентацыя |
| 1.4.2 | Мянушкі, іх паходжанне і месца ў антрапанімічнай сістэме. Сучасныя беларускія мянушкі. | 6 | Сабраць беларускія мянушкі, што выкарыстоўваюцца ў беларусаў, зрабіць іх аналіз. | Картатэка моўных фактаў; рэферат |
| 1.4.3 1.5.2 | Онімы ў кантэксце мастацкага твора. | 4 | Правесці аналіз ужывання онімаў у мастацкім тэксце. Вызначць функцыю онімаў ў тэкстах мастацкай літаратуры. | Даклад |
| 1.7.1 | Агульная характарыстыка беларускай ктэматаніміі. Разрады ктэматонімаў, іх роля і месца ў анамастычнай прасторы і грамадскім жыцці. | 2 | Сабраць і раскласіфікаваць беларускія ктэматонімы | Картатээка моўных фактаў; рэферат. |
| 1.8.1 | Анамастычная лексікаграфія | 2 | Падрыхтаваць рэферат пра анамастычную лексікаграфію. | Рэферат |

# РЭЙТЫНГАВАЯ РАБОТА № 1

## Тэрміналагічны дыктант

***Дайце азначэнне наступным тэрмінам.***

1. Анамастыка, онім, анамастычная прастора, антрапонім, тапонім, гідронім, айконім, фіктонім, анамастычныя ўніверсаліі, анімізацыя апелятываў, апелятывацыя оніма (дэанімізацыя), трансанімізацыя.

2. Назавіце асноўныя медады даследавання ў анамастыцы.

# РЭЙТЫНГАВАЯ РАБОТА № 2

***Падрыхтуйце рэферат на тэму (на выбар студэнта)***

1. Асаблівасці ўласных асабовых імён у розныя гістарычныя перыяды.
2. З гісторыі ўзнікнення і фарміравання прозвішчаў.
3. Асаблівасці ўсходнеславянскіх антрапонімаў з адмоўем *не-*.
4. Мянушкі людзей як спецыфічны від антрапанімных адзінак.
5. Імёны ў розных соцыумах і ў розных моўных падсістэмах.
6. Беларуская анамастычная лексікаграфія.
7. Уклад М.В. Бірылы ў навуку аб уласных імёнах.
8. Гісторыя жаночых імён на Беларусі.
9. Уплыў моды на выбар імені.
10. Спецыфіка іменніка старавераў.
11.Імёны-мянушкі сваёй вёскі (раёна, групы).
12. Таямніцы імён і абрадаў.
13. Традыцыі надання імені ў славян у язычніцкі і хрысціянскіперыяды.
14. Беларускія тапонімы.
15. Назвы населеных пунктаў Беларусі з пункту гледжання этымалогіі.
16. Неафіцыйныя назвы гарадскіх аб’ектаў.
17. Урбананімія: лексіка-семантычны аспект.
18. Урабанімія: праблемы перайменавання.
19. Касмонімы і астронімы, народная касманіміка.
20. Этнонімы, іх гісторыя і тыпы.
21. Імяннік свайго раёна ў сацыялінгвістычным аспекце.
22. Беларуская тэанімія.
23. Літаратурная анамастыка Беларусі: гісторыя і перспектывы.
24. Сутнасць новых тэорый пра ўплыў імені на характар і лёс чалавека.
25. Антрапанімія на старонках беларускай перыёдыкі.

26. З гісторыі паходжання ўласных назваў роднай зямлі.
27. Уласнае імя як кампанент фразеалагізмаў.

## РЭЙТЫНГАВАЯ РАБОТА № 3

***Выканайце тэст***

**1. Дапоўніце сказ.**

Утварэнне новых уласных імёнаў шляхам пераносу вядомага імя ў іншы анамастычны клас называецца ______.

**2. Назавіце прозвішча заснавальніка анамастычнай навукі на Беларусі:**

1) Ф.М. Янкоўскі;
2) П.А. Бузук;
3) Л.А. Антанюк;
4) М.В. Бірыла;
5) А.А. Станкевіч.

**3. Назавіце факультатыўныя (неабавязковыя) для кожнагачалавека антрапанімныя адзінкі**:

а) прозвішча;
б) мянушка;
в) асабовае імя;
г) псеўданім;
д) імя па бацьку.

**4. Якая антрапанімная адзінка мае значэнне “неафіцыйнае найменнечалавека, дадзенае па яго знешніх ці ўнутраных асаблівасцях, паводзінах,характары заняткаў, пасадзе, прозвішчы і інш.”?**

а) прозвішча;
б) мянушка;
в) асабовае імя;
г) псеўданім;
д) імя па бацьку.

**5. Якія функцыі выконвалі мянушкі ў старажытнасці?**

а) намінатыўна-ідэнтыфікацыйную;
б) прафілактычную;
в) пажадальную;
г) эмацыянальна-экспрэсіўнай характарыстыкі.

**6. Хто з’яўляецца аўтарам «Слоўніка беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў (XVI–XX стст.)»?**

а) В.В. Шур;
б) М.В. Бірыла;

в) Ю.А. Гурская;

г) Г.К.Усціновіч;

д) Я. У. Саламевіч.

**7. Паэтонім – гэта …**

а) онім, што ўжываецца ў паэтычным тэксце;

б) антрапонім, які ўжываецца ў паэзіі;

в) онім, выдуманы паэтам;

г) уласнае імя мастацкага тэксту.

**8. Нацыянальны беларускі рэпертуар імён – гэта**…

а) усе імёны, што ўжываюцца беларусамі;

б) усе імёны, што ўжываюцца на тэрыторыі Беларусі;

в) найбольш папулярныя імёны;

г) традыцыйныя беларускія імёны.

**9. Адзначце імёны па бацьку, у якіх пры перакладзе на беларускуюмову адбудзецца з‘ява якання.**

а) Еремеевич;

б) Ефимович;

в) Ермолаевич;

г) Евдокимович;

д) Ефремович.

**10. Адзначце імёны па бацьку, у якіх пры перакладзе на беларускуюмову адбудзецца з‘ява дзекання.**

а) Диогенович;

б) Леонидович;

в) Родионович;

г) Динарович;

д) Демидович.

**11. Адзначце імя па бацьку, утворанае ад імені Антон.**

*а) Антанінавіч;*

*б) Антоніевіч;*

*в) Антоньевіч;*

*г) Анцімонавіч;*

*д) Антонавіч.*

**12.Якім тэрмінам прынята называць выдзеленыя фінальныяэлементы ў прозвішчах *Бык-аў, Арлоў-скі, Барыс-ёнак*?**

а) суфіксы;

б) канчаткі;

в) суфіксоіды;

г) карані;

д) прозвішчаўтваральныя фарманты.

**13. У аснове якіх прозвішчаў ляжаць уласныя асабовыя імёны абоіх формы?**

а) Курыла;

б) Сянчура;

в) Алёхна;

г) Гуменнік;

д) Прымакоў

**14.Па якіх прыметах з вялікай доляй верагоднасці можнасцвярджаць, што носьбіт прозвішча – карэнны беларус?**

а) прозвішча заканчваецца на -енка/-энка/-анка;

б) прозвішча з’яўляецца першасным, а не другасным;

в) прозвішча заканчваецца на –онак/-ёнак;

г) прозвішча ўтворана ад уласнага асабовага імені;

д) прозвішча заканчваецца на –эня/-еня.

**15. Як скланяюцца прозвішчы тыпу *Харужы, Харошанькі*?**

а) як рознаскланяльныя назоўнікі;

б) як прыметнікі;

в) як назоўнікі 2-га скланення;

г) не скланяюцца ўвогуле.

***16. Якія прозвішчы маюць у сваім складзе неславянскія фарманты?***

а) Эрдман;

б) Скараход;

в) Давідсон;

г) Недасека;

д) Кандынашвілі.

# АПІСАННЕ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для атрымання аб'ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы.

Вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, вусныя паведамленні, вусны залік.

Пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, пераклад тэкстаў па спецыяльнасці з рускай мовы на беларускую, рознаўзроўневыя кантрольныя заданні, у тым ліку не менш як дзве кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовы залік.

Тэставы кантроль: падбор кароткіх адказаў у адпаведнасці з заданнямі.

# КРЫТЭРЫІ І ПАКАЗЧЫКІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ НА ЭКЗАМЕНЕ

| Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|
| **10** | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам і паказвае яго поўнае разуменне; выяўляе самы высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага, абгрунтавана выкладае свае думкі, выкарыстоўваючы звесткі з дадатковай літаратуры, робіць самастойныя вывады і заключэнні, падмацоўвае свой адказ уласнымі ілюстрацыямі-доказамі. Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Перадае матэрыял паслядоўна, захоўваючы нормы літаратуранай  мовы; праяўляе адказнасць, пазнавальную актыўнасць і крэатыўнасць. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **9** | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам, дае поўнае азначэнне лінгвістычным паняццям, выяўляе высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага і ўменне аргументавана выкладаць яго, падмацоўвае свой адказ яркімі ілюстрацыямі-доказамі (як з дапаможнікаў, так і самастойна падабранымі). Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **8** | Студэнт у дастаткова поўным аб'ёме валодае вучэбным матэрыялам, самастойна абгрунтоўвае свой адказ і прыводзіць ілюстрацыі-доказы, узятыя з дапаможнікаў ці лекцый. Пры выкананні аналізу моўных фактаў дапускае асобныя недакладнасці, якія сам жа выпраўляе. Матэрыял выкладае паслядоўна, з захаваннем літаратурных нормаў; не дапускае  фактычных памылак. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **7** | Студэнт у дастаткова поўным аб'ёме перадае вучэбны матэрыял з асобнымі недакладнасцямі, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў; можа абгрунтаваць свой адказ, прывесці ілюстрацыі-доказы; матэрыял выкладае паслядоўна з нязначнымі адхіленнямі ад літаратурнай нормы. Аналіз моўных фактаў выкананы з некаторымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **6** | Студэнт перадае вучэбны матэрыял з нязначнымі памылкамі, але выпраўляе іх з дапамогай выкладчыка; тэарэтычныя звесткі падмацоўвае ілюстрацыямі, але без дастаткова глыбокага і доказнага іх абгрунтавання; дапускае недакладнасці ў паслядоўнасці выкладу матэрыялу і яго моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з нязначнымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **5** | Студэнт ў асноўным ведае і разумее галоўныя палажэнні тэмы, але дапускае памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, якія можа выправіць з дапамогай выкладчыка; выкладае матэрыял непаслядоўна; дапускае памылкі ў моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з памылкамі, якія |

| | |
|---|---|
| | выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **4** | Студэнт няпоўна выкладае праграмны вучэбны матэрыял, дапускае асобныя памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, не ўмее абгрунтаваць свае разважанні, адчувае цяжкасці пры падборы ілюстрацый; парушае паслядоўнасць выкладу матэрыялу, дапускае памылкі ў моўным афармленні адказу. Моўны аналіз выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **3** | Студэнт ўзнаўляе нязначную частку вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы з грубымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **2** | Студэнт называе асобныя моўныя факты з вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **1** | Студэнт не валодае нават асобнымі фактамі з вучэбнага матэрыялу, не ўсведамляючы іх месца ў агульнай моўнай сістэме. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| **Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму** |
|---|---|---|---|
| Гісторыя беларускай мовы | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Прапаноў няма | узгадніць, пратакол № 6 ад 27.12.2019 |
| Беларуская дыялекталогія | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Прапаноў няма | узгадніць, пратакол № 6 ад 27.12.2019 |
| Сучасная беларуская літаратурная мова | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Прапаноў няма | узгадніць, пратакол № 6 ад 27.12.2019 |
| Актуальныя праблемы беларускай мовы | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Прапаноў няма | узгадніць, пратакол № 6 ад 27.12.2019 |

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “БЕЛАРУСКАЯ АНАМАСТЫКА”

1. Анамастыка як раздзел мовазнаўства. Прадмет, мэта і задачы дысцыпліны. Асноўныя раздзелы сучаснай анамастыкі.
2. Сувязь анамастыкі з іншымі навукамі (лінгвістыкай, логікай, сацыялогіяй, археалогіяй, этнаграфіяй, геаграфіяй, літаратуразнаўствам і інш.)
3. Перыядызацыя гісторыі анамастычнай навукі.
4. Уласнае імя як лінгвістычная катэгорыя.
5. З гісторыі вывучэння ўласных імёнаў.
6. Анамастычная прастора. Аб’ём і змест анамастычнай прасторы. Сістэмныя сувязі ў анамастычнай прасторы.
7. Класіфікацыя ўласных імёнаў.
8. Асноўныя метады анамастычных даследаванняў (апісальны, гістарычны, параўнальна-супастаўляльны, арэальны, семіятычны, лінгвапсіхалагічны, статыстычны і інш.).
9. Праблемы перыядызацыі ўсходнеславянскай антрапаніміі.
10. Асноўныя этапы і працэсы ў гісторыі беларускай антрапаніміі.
11. Асноўныя перыяды ў развіцці беларускай антрапаніміі і іх адметнасці.
12. Сучасныя беларускія прозвішчы. Тыпы беларускіх прозвішчаў паводле іх лексіка-семантычнага складу.
13.Сучасныя беларускія прозвішчы. Тыпы беларускіх прозвішчаў паводле структурна-тыпалагічных асаблівасцей.
14. Мянушкі, іх паходжанне і месца ў антрапанімічнай сістэме.
15. Псеўданімы, іх разнавіднасці і спосабы ўтварэння.
16. З гісторыі беларускай тапанімікі.
17. Асноўныя разрады тапанімічных назваў (гідронімы, айконімы, урбанонімы і інш.). Моўная прыналежнасць тапонімаў Беларусі.
18. Змест і аб’ём тэрмінаў ‘касманімія’ і ‘астранімія’. Асаблівасці беларускай народнай касманімікі.
19. Агульная характарыстыка беларускай ктэматаніміі.
20. Уласныя імёны (антрапонімы, тапонімы і інш.) у мастацкім творы, іх структура, стылістычныя функцыі.
21. Анамастычная лексіка і яе вывучэнне ў школе. Пазакласная праца з вучнямі па зборы і вывучэнні онімаў.
22. Анамастычная лексікаграфія.